


# НА ДЗВЮХ МОВАХ

**У гродзенскім выдавецтве «ЮрСаПрынт» выдадзены чарговы зборнік песенных тэкстаў. Аўтарам новай музычнай кнігі пад назвай «За крок да песні» («За шаг до песни») з'яўляецца наш калега па Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Уладзімір Руль (Воранаўскі раён).**

У новы зборнік песень Уладзіміра Руля ўвайшлі творы, напісаныя паэтам у перыяд з 2000 па 2023 гады, на беларускай і рускай мовах (23 тэксты – па-беларуску і 36 песень –- па-руску). Як вядома, Уладзімір Валяр'янавіч сам вельмі добра спявае, з вялікай павагай і любоўю ставіцца да гэтага віду мастацтва. Асноўныя тэмы, закранутыя паэтам-песеннікам, знайшлі адлюстраванне ў назвах твораў: «Матылі ля Скарбянкі», «Нацкая полька», «Мядовы пах», «Адзіны мой, каханая мая!», «Песня вяскоўцаў», «Песня пра Шчучын», «Горад Ліда», «Астрына наша любая», «Жыве Новы Двор!», «Песня пра Воранава», «Песня пра вёску Першамайск», «Я – вясковец!», «У памяць аб школе» і інш. Назвы песень з рускамоўнага раздзела таксама шмат у чым паказальныя: «Родительский наказ», «Афганский реквием», «Песня вороновчан», «Спасибо учителям», «Песня о лифте», «Песня пограничников», «Милые врачи», «Школьный вальс» і інш.

Уладзімір Руль размясціў у абодвух раздзелах кнігі свайго роду кароткія звароты да чытача. *«Паважаны чытач, калі ты здольны ўпрыгожваць паэтычныя радкі меладычнай музыкай, гэта значыць, ствараць песні – буду ўдзячны табе ў выпадку найхутчэйшай рэалізацыі творчых намераў у адносінах да змешчаных у гэтым зборніку тэкстаў. Песні, якія з'явяцца, маглі б увайсці ў склад дабрачыннага канцэрта».* І на рускай мове: *«Уважаемые профессиональные и самодеятельные композиторы, обращаюсь к вам с просьбой о создании музыки к имеющимся в этом сборнике текстам. Написанные песни могли бы стать основой благотворительного концерта!».* Ідэя дабрачыннага канцэрта, пра які гаворыцца ў звароце, узнікла ў паэта даволі даўно. Яго мэта – з дапамогай мастацтва прынесці практычную карысць свайму роднаму краю, накіраваўшы сабраныя за канцэрт грашовыя сродкі тым, хто ў іх мае патрэбу.

Пяць песень са зборніка Уладзіміра Руля «За крок да песні» («За шаг до песни») ужо напісаны гродзенскімі кампазітарамі Валерыем Кручковым і Ірынай Трацяк. Пяць крокаў да мэты зроблены. А яшчэ песня «Нас греет жизни лето», музыку да якой напісаў кампазітар з Воранава Аляксандр Мацюк, ужо выконваецца гродзенскім хорам ветэранаў. Адметнасцю кнігі песенных тэкстаў Уладзіміра Валяр'янавіча Руля з'яўляецца так званы рэгіянальны фактар, – творы прысвячаюцца населеным пунктам трох раёнаў Гродзенскай вобласці – Воранаўскага, Шчучынскага і Лідскага.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**